Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 14:43:55

DOI:10.17951/sb.2024.18.313-318
Studia Białorutenistyczne 18/2024 REVIEWS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Inna Kalita

Belarusian Institute in Prague (the Czech Republic)
e-mail: inna.kalita@belarus-institute.cz
https://orcid.org/0000-0003-0005-1425

Mirosław Jankowiak. *Współczesne gwary białoruskie na Litwie*. Tom pierwszy: *Rejon orański / Šiuolaikinės baltarusių šnektos Lietuvoje*. Pirmasis tomas: *Varėnos rajonas*. Vilnius: Lietuvių kalbos institutas, 2023, 260 s.

Mirosław Jankowiak. Contemporary Belarusian subdialects in Lithuania. First volume: Varėna distric. Vilnius: Lithuanian Language Institute, 2023, p. 260

У 2023 г. выйшла манаграфія Міраслава Янковяка *Współczesne gwary białoruskie na Litwie. Tom I: Rejon orański* [*Сучасныя беларускія гаворкі ў Літве. Том першы: Варэнскі раён*]. Кніга прэзентуе новыя матэрыялы навукоўца, які больш за дваццаць гадоў даследуе балта-славянскае памежжа. Яго навуковыя інтарэсы ў галіне славянскай дыялекталогіі закранаюць шырокі спектр пытанняў, звязаных з моўным, нацыянальным і рэлігійным памежжам, дзе выступаюць адметныя моўныя рысы і культурна-гістарычныя маркеры суседніх культур. У працах М. Янковяка гучыць беларуска-літоўскае, беларуска-польскае, беларуска-рускае шматгалоссе, а запісаныя лексемы адлюстроўваюць працэсы актыўнай інтэрферэнцыі. Вучоны падкрэслівае, што поўнае разуменне спецыфікі літоўскіх гаворак памежнай тэрыторыі немагчыма без ведання мясцовых польскіх і беларускіх гаворак, таксама як і паглыбленае апісанне мясцовай разнавіднасці польскай мовы немагчыма без параўнання яе з літоўскімі і беларускімі дыялектамі. На беларуска-літоўскім памежжы функцыянавалі і зараз суіснуюць літоўская мова і яе дыялекты, польская (у яе мясцовым варыянце), беларуская гаворка і руская мова. Такі суплёт этнамоўных кантактаў заслугоўвае ўвагі, таму што з'яўляецца крыніцай вывучэння гісторыі і асаблівасцей кожнай з названых моў і моўных варыянтаў. Гэтыя і іншыя пытанні разглядае ў сваёй

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 14:43:55

манаграфіі польскі навуковец, які выдатна валодае беларускай мовай і заслугі якога перад беларускай дыялекталогіяй цяжка пераацаніць.

Рэцэнзаваная кніга з'яўляецца вынікам некалькіх дыялекталагічных экспедыцый аўтара, пачатак якім быў пакладзены ў 2014 г. Кніга складаецца з *Przedmowy* [*Прадмовы*], пяці частак (*Charakterystyka badanego obszaru* [I. *Характарыстыка даследуемага рэгіёна*], *Charakterystyka gwar białoruskich w rejonie Orańskim* [II. *Характарыстыка беларускіх гаворак Варэнскага раёна*], *Słowniczek gwary białoruskiej rejonu Orańskiego* [III. *Слоўнічак беларускай гаворкі Варэнскага раёна*], *Teksty gwarowe* [IV. *Дыялектныя тэксты*], *Aneks* [V. *Дадатак*], які аб'ядноўвае інфармацыйныя паказчыкі: *Spis informatorów* [*Спіс інфарматараў*], *Spis nazw geograficznych* [*Спіс геаграфічных назваў*] і *Spis skrótów* [*Спіс скарачэнняў*]), а таксама бібліяграфіі і дзвюх разгорнутых анатацый на літоўскай і англійскай мовах.

I. Частка *Charakterystyka badanego obszaru* [*Характарыстыка даследуемага рэгіёна*] знаёміць з геаграфічнымі, гістарычнымі і сацыяльнымі ўмовамі развіцця Варэнскага раёна, апісвае агульную сацыялінгвістычную сітуацыю. Аўтар знаёміць чытача са станам даследавання дадзенага арэала, вызначае мэты і метады даследавання, канкрэтызуе тэрміналогію. Удакладненне тэрмінаў, абраных для названай працы, вельмі дарэчы. Некаторыя з іх на сучасным этапе маюць размытыя межы. Разглядаемае вучоным памежжа характарызуецца шматмоўем, а мова рэспандэнтаў – адрозным наборам актыўных і пасіўных моў і розным узроўнем валодання імі. Індывідуальны партрэт моўцы звязаны з шэрагам сацыялагічных фактараў: узростам, гісторыяй, адукацыяй, месцам працы і іншымі паказчыкамі. Аўтар разглядае *інтэрферэнцыю* як вынік натуральнага шматмоўя, і выкарыстоўвае гэты тэрмін як нейтральны, а саму з'яву не разглядае як адхіленне ад нормы. Гэта дазваляе трактаваць моўныя варыянты не як парушэнне ўзусу, а як з'яву, якая мае поўнае права на існаванне ва ўмовах натуральнага змешвання кодаў. Вучоны надае таксама ўвагу такім тэрмінам, як: *простая мова, мова прымарная* і *мова секундарная*[1].

II. Частка *Charakterystyka gwar białoruskich w rejonie Orańskim* [*Характарыстыка беларускіх гаворак Варэнскага раёна*] пачынаецца агульнай характарыстыкай дыялектных асаблівасцей абранага арэала, які ў сваіх моўных рысах – фанетычных і граматычных з'яўляецца натуральным працягам гаворак

[1] На асаблівасці разумення зместу канкрэтных тэрмінаў у даследаваннях розных вучоных звяртаюць увагу і іншыя даследчыкі, гл. напрыклад панянцці абазначаюць канкрэтныя тэрміны ў даследаваннях розных вучоных, звяртаюць увагу і іншыя даследчыкі, параўн. артыкул Катажыны Сіцінськай (Sicińska, 2020, s. 237–262), раздзел *Podstawowe pojęcia i terminy lingwistyczne* [Асноўныя паняцці і лінгвістычныя тэрміны] у манаграфіі Ядвігі Казлоўскай-Доды (Kozłowska-Doda, 2021, s. 21–37) і артыкул той жа даследчыцы (Kozłowska-Doda 2016, s. 253–254).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 14:43:55

паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы, гаворак *гродзенска-баранавіцкай групы*. Аўтар падрабязна апісвае найбольш характэрныя фанетычныя рысы, як, напрыклад, ужыванне гукаў [h]/[g], [ў], асаблівасці дзекання і цекання, палаталізаваных [г], [к], [х], недысімілятыўнага акання і якання, тыпаў екання, рэалізацыю гука [о], прыстаўных зычных і некаторых іншых. Уводную частку ўдала дапаўняюць карты, якія паказваюць межы традыцыйна афармленых груп беларускіх гаворак. Увага нададзена таксама марфалагічным прыкметам і сінтаксічным асаблівасцям. Лексіка гэтага раёна, у адрозненні ад Салечніцкага і Віленскага раёнаў Літвы, да гэтага часу не была прадметам дэталёвага вывучэння. Экспедыці, здзейсненыя ў 2014 і 2023 гг., дапамаглі аўтару дакументальна падцвердзіць яго першапачатковую гіпотэзу, што гаворка мясцовага насельніцтва, з аднаго боку, характарызуецца асаблівай лексікай, гарадзенска-баранавіцкай групе паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы, і з другога боку, мае шэраг запазычанняў з балтыйскіх моў і іх дыялектаў, пераважна – з літоўскіх, а таксама запазычанняў з польскай мовы. Існуе немалая група слоў, характэрных для заходняй дыялектнай зоны, якая фармавалася на працягу стагоддзяў як кантактная з польскай мовай. Арэал узнікнення вялікай колькасці лексем больш-менш супадае з адміністрацыйным падзелам, які існаваў да 1939 г., калі Заходняя Беларусь, а таксама паўднёвая і паўднёва-ўсходняя часткі Літвы ўваходзілі ў склад II Рэчы Паспалітай. Лексічныя запазычанні прадстаўлены аўтарам у раздзелах *балтызмы/літуанізмы, паланізмы* і *русізмы*.

Даследчык не пакідае па-за ўвагай фразеалогію, якая ў дыялекталагічных працах, акрамя непасрэдна арыентаваных на фраземы, звычайна не ўваходзіць у падобнага тыпу публікацыі. Апісана невялікая колькасць фразеалагізмаў, пераважна агульнавядомых для носьбітаў беларускай літаратурнай мовы, але сярод іх ёсць выразы, якія ў беларускіх фразеалагічных слоўніках не былі занатаваны.

> *„Dziéŭka jak viécier* ‘актыўная дзяўчына / aktywna dziewczyna’ Jak ja dziéŭka bylá, to ja bylá jak viécier, dachódnaja, ja vieś dzie bylá, i spiaváć, i kancérty [K 1939 Rudnia]”.
> *„Kóžny śviénty máje svajé vykrénty* ‘кожны святы мае свае спосабы / każdy święty ma swoje wykręty / sposoby’ *Kóžny śviénty máje svajé vykrénty* [K 19390 Bołboty]” (Jankowiak, 2023, s. 78).

III. Частка *Słowniczek gwary białoruskiej rejonu Orańskiego* [*Слоўнічак беларускай гаворкі Варэнскага раёна*] падзелена на асобныя тэматычныя раздзелы: 1. Метэаралогія, мясцовасць, час. 2. Свет раслін. 3. Жывёльны свет. 4. Сельская гаспадарка. 5. Чалавек 6. Умовы жыцця. 7. Народная і духоўная культура. 8. Дзяржава, эканоміка, кіраванне, адукацыя, горад. 9. Астатні лексічны запас. Асобныя прыведзеныя ў слоўніку словы праілюстраваны фотаздымкамі.

IV. Частка *Teksty gwarowe* [*Дыялектныя тэксты*] змяшчае надзвычай каштоўны матэрыял, які вуснамі рэспандэнтаў расказвае пра жыццё мясцовых

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 14:43:55

жыхароў – як было і як жылі даўней, як і што гатавалі, у што апраналіся, пра святы і вяселлі, пра тое, як людзей заганялі ў калгасы і г.д. Немалаважна ў кантэксце даследавання арэалаў са "змяшанай свядомасцю" адлюстраванне таго, як людзі самі ўспрымаюць сваё карыстанне некалькімі мовамі і як разумеюць узаемаадносіны кантактных моў, у прасторы якіх яны жывуць. Прывядзём адзін з прыкладаў:

> *O znajomości języka litewskiego*
> Na litóŭskom to ja nie znáju. Nie búdu havarýć. Janý na mianié havaráć, i pretsiedácieĺ kalchóza ráńše havarýŭ «To vy stóĺka, kažú, pražylí dvácceć liet u Litvié, i nie‿ŭmiéjecie pa-litóŭski razhavárývać», to ja kažú – ja užó nie incierasújusia, ja užó tóje, vúčacca puść dziéci havaráć, a ja kažú, tóje znáju, što umiéju. I tóje, ja kažú, ja znáju, što janá havóryć, jak jiná nia‿chóča havarýć. Trócha piáta praz dziasiáta, to močúcie, to birnúkas, to miergiájcie, vo takích sloŭ trócha znáju. I tak havóryš što-nibúć, i tarhúješ, to ja znáju, što janý havórać, nu atviécić nie mahú, ja i nie piereviadú. Ja nie vučýla, nie izučála, ja jevó nie piereviadú. Ja znáju, što janá havóryć, ja i tak jej dajú, kažú...kab‿dalá dziénhi, to ja joj padajú, skóĺka janá skáže, to ja panimáju, što skazála, alié ja jijé atviécić nie mahú. A dać to dam, i‿ŭ aptécy, i z vračóm. Vrač pajédzieš, to jon pa-litóŭsku havóryć, alié jak skážeš, što nie panimáju pa-litóŭsku, to skáže pa-rúsku. Tak havórym ni pa-rúski, ni pa-bielarúski baĺšynstvó [K 1932 Bołboty] (Jankowiak, 2023, s. 166–167).

У IV частцы прадстаўлены тэксты, запісаныя аўтарам у некалькіх вёсках (падаём назвы ў польскай моўнай версіі: *Bołboty, Dubicze, Rudnia, Kotra, Paramok, Kowalki, Raki, Krzywile, Kijucze*). Аўтар абачліва падыходзіць да перадачы ўсіх існуючых назваў мясцовасцяў, у якіх збіраў матэрыял – назвы вёсак занатаваны ў табліцы ў трох варыянтах: назва, выкарыстаная ў тэксце манаграфіі – афіцыйная назва – гутарковы варыянт (напрыклад: Koleśniki (LT) – Kalesninkai – Kaliesníki).

Кніга прадстаўляе асноўны тэарэтычны матэрыял па-польску, яго дапаўняюць разгорнутыя змястоўныя анатацыі па-літоўску і па-англійску, запісы беларускіх дыялектных тэкстаў зроблены лацінкай. Адзінае, у чым можна папракнуць аўтара – адсутнасць у кнізе, прысвечанай беларускім дыялектам, разгорнутай анатацыі на беларускай мове. Варта адзначыць прадуманае графічнае афармленне кнігі, назвы частак вылучаны колерам, акрамя таго, аўтар змяшчае фотаздымкі з уласнага фотаархіва, зробленыя ім падчас экспедыцый, што выгодна вылучае рэцэнзаваную манаграфію з шэрагу тыповых навуковых выданняў.

У кантэксце дыялекталагічных даследаванняў варта ўзгадаць закон *Аб абароне персанальных дадзеных*, які пачаў дзейнічаць у Еўрапейскім Саюзе на пачатку XXI ст. Яго ўвядзенне ўнесла карэктывы ў традыцыйныя нормы немаладой дыялекталагічнай навукі – значна абмежаваліся звесткі пра рэспандэнтаў. Тое, што раней уваходзіла ў змест дыялекталагічнага апісання – асоба інфарманта і яго дакладныя біяграфічныя звесткі, у цяперашніх умовах мусіць быць нівелявана. Новы закон абмяжоўвае і ў нейкай меры спрыяе зніжэнню цэласнасці ў прэзентацыі

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 14:43:55

назапашанага матэрыялу дыялектолагаў. Асоба рэспандэнта, зафіксаваная ў даследаваннях, часта станавілася часткай гісторыі, каштоўным узорам (гл. напрыклад кнігі гомельскага фальклярыста і этнографа Генадзя Лапаціна *Варвара Грэцкая як з'ява беларускай народнай культуры* (Lapacìn, 2015), *К каждаму разгавору прыказка ё...* (Lapacìn, 2018), і *Паслядоўніца* (Lapacìn, 2023), у аснове якіх ляжыць матэрыял, запісаны фальклярыстам ад адной жанчыны – Варвары Грэцкай.

Навуковая дыялекталагічная скарбонка М. Янковяка ахоплівае лексіку беларускіх сумежжаў па-за тэрыторыяй Беларусі, якія для беларускіх дыялектолагаў зараз з'яўляюцца недасяжнымі. Вучоны працягвае традыцыі Варшаўскай славістыкі, і шырэй – польскай дыялекталогіі, прадстаўнікі якой займаліся і працягваюць займацца і ўсходнім памежжам у шырокім яго значэнні, і беларускімі дыялектамі, у прыватнасці, напрыклад: Антаніна Абрэмбска-Яблоньска (Obrębska-Jabłońska, 1993), Эльжбета Смулкова (Smułkowa, 1968; Pogranicza, 2007; Brasławszczyzna, 2009 і 2011), Міхал Саевіч (Sajewicz, 2002, 2013, 2019), Ніна Баршчэўска (Barszczewska, Jankowiak, 2012), Багуміл Астроўскі (Ostrowski, 2013), Ядвіга Казлоўская-Дода (Kozłowska-Doda, 2016 і 2021), Анна Жаброўская (Żebrowska, 2019), Катажына Канчэўская (Konczewska, 2021 і 2024) і шмат іншых. М. Янковяк значна пашырае арэал даследавання беларускіх замежных гаворак, выходзіць па-за Падляшша, якое доўгі час з'яўлялася прадметам даследавання Эльжбеты Смулковай, Міхала Саевіча, Ніны Баршчэўскай і інш. Сёння па-за межамі Беларусі М. Янковяк з'яўляецца адным з найбольш вядомых дыялектолагаў-беларусістаў, даследчыцкі патэнцыял якога можна параўнаць з працай цэлай кафедры. Яго кнігі з'яўляюцца прыкладам пільнай працы з назапашаным матэрыялам, што даказвае і рэцэнзаваная манаграфія, задуманая аўтарам як першы том новай серыі.

REFERENCES

Barszczewska, Nina, Jankowiak, Mirosław. (2012). *Dialektologia białoruska*. Warszawa: Slawistyczny Ośrodek Wydawniczy Instytutu Slawistyki PAN.

Brasławszczyzna. Pamięć i współczesność. T. 1: Elżbieta Smułkowa, (red.), *Historia regionu. Charakterystyka socjolingwistyczna. Świadectwo mieszkańców*. (2011). Warszawa: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego.

Brasławszczyzna. Pamięć i współczesność. T. 2: *Słownictwo*. (2009). Red. Elżbieta Smułkowa. Warszawa: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego.

Jankowiak, Mirosław. (2023). *Współczesne gwary białoruskie na Litwie. Tom pierwszy: Rejon orański / Šiuolaikinės baltarusių šnektos Lietuvoje. Pirmasis tomas: Varėnos rajonas*. Vilnius: Lietuvių kalbos institutas.

Konczewska, Katarzyna. (2021). *Polacy i język polski na Grodzieńszczyźnie*. Kraków: Instytut Języka Polskiego PAN.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 14:43:55

Konczewska, Katarzyna. (2024). *Wałaczajka. Zbiory Muzeum Etnograficznego w Krakowie z terenu Białorusi w badaniach językowo-kulturowych*. Kraków: Muzeum Etnograficzne w Krakowie, Instytut Języka Polskiego PAN.

Kozłowska-Doda, Jadwiga. (2016). Białoruś jako pogranicze a pogranicza Białorusi: zarys problematyki badań językoznawczych z przełomu XX i XXI w. *Studia Białorutenistyczne*, 10, s. 234–261, http://dx.doi.org/10.17951/sb.2016.10.235.

Kozłowska-Doda, Jadwiga. (2021). *Tożsamość, losy i język najstarszych mieszkańców okolic Dociszek na Białorusi (na podstawie badań terenowych z przełomu XX i XXI w.)*. Lublin: Werset.

Lapacìn, Genadz′. (2015). *Varvara Grèckaâ âk z`âva belaruskaj narodnaj kul'tury*. Gomel′: Bark. [Лапацін, Генадзь. (2015). *Варвара Грэцкая як з'ява беларускай народнай культуры*. Гомель: Барк].

Lapacìn, Genadz′. (2018). *„K každamu razgavoru prykazka ë.": z vopytu vyvučènnâ dyâlektnaj frazealogìi. Matèryâly da frazealagìčna-parèmìalagìčnaga sloŭnìka asoby. Varvara Alâksandraŭna Garèckaâ. Zapìsy 2005–2012 gg.* Gomel′: bez wydawnictwa. [Лапацін, Генадзь. (2018). *„К каждаму разгавору прыказка ё.": з вопыту вывучэння дыялектнай фразеалогіі. Матэрыялы да фразеалагічна-парэміалагічнага слоўніка асобы. Варвара Аляксандраўна Гарэцкая. Запісы 2005–2012 гг.* Гомель: без выдаўніцтва].

Lapacìn, Genadz′. (2023). *Paslâdoŭnìca.* Gomel′: Bark. [Лапацін, Генадзь. (2023). *Паслядоўніца*. Гомель: Барк].

Obrębska-Jabłońska, Antonina. (1993). *Śladami żywego języka. Wybór pism*. Elżbieta Smułkowa, (red.). Warszawa: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego.

Ostrowski, Bogumił. (2013). *Białoruskie gwary Grodzieńszczyzny: wybrane zagadnienia*. Kraków: Instytut Języka Polskiego PAN.

Pogranicza Białorusi w perspektywie interdyscyplinarnej. (2007). Elżbieta Smułkowa, Anna Engelking, (red.). Warszawa: Ośrodek Badań nad Tradycją Antyczną w Polsce i Europie Środkowo-Wschodniej, Towarzystwo Naukowe Warszawskie

Sajewicz, Michał. (2002). *Derywacja sufiksalna osobowych nazw subiektów w nadnarwiańskich gwarach białoruskich Białostocczyzny. Deverbativa deadiectiva*. Lublin: Wydawnictwo UMCS.

Sajewicz, Michał. (2013). *Nazwiska patronimiczne z formantem na -uk w powiecie hajnowskim na Białostocczyźnie na tle ogólnopolskim*. Lublin: Wydawnictwo UMCS.

Sajewicz, Michał. (2019). *Odczasownikowe pejoratywne nazwy subiektów z formantem sufiksalnym w peryferyjnych gwarach białoruskich okolic Lewkowa Starego na Białostocczyźnie*. Lublin: Wydawnictwo UMCS.

Sicińska, Katarzyna. (2020). O statusie i nazewnictwie odmian języka polskiego na dawnych Kresach Wschodnich, *Prace Filologiczne*, LXXV, cz. 2, s. 237–262, https://doi.org/10.32798/pf.682

Smułkowa, Elżbieta. (1968). *Słownictwo z zakresu uprawy roli w gwarach wschodniej Białostocczyzny na tle wschodniosłowiańskim*. Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich.

Żebrowska, Anna. (2019). *Komarowszczyzna. Język pogranicza białorusko-polsko-litewskiego*. Poznań: Uniwersytet im. Adama Mickiewicza.